**Алесь Разанаў**

# Дождж: возера ў акупунктуры

Пункціры

www.kamunikat.org

Мінск
Выдавец І. П. Логвінаў
2007

УДК 881.161.3-1
ББК 84 (4Беи)-5 Р 17

**ISBN** 978-985-6800-42-2

© Разанаў А. С., 2007
© Выдавец І. П. Логвінаў, 2007

www.kamunikat.org

Залевы.
Дражняць міражы.
Гудуць вятры пры падыходзе...
Мы кожны дзень на рубяжы
былых і будучых стагоддзяў.

Калі ўсе згублены ключы,
калі ні шанцу,
анічога —
усё ж ідзі,
любі,
крычы
і пасягай на перамогу.

Не вернецца воін,
вандроўнік не вернецца,
вернецца сейбіт...
Заўсёды
вяртаецца сейбіт.

Што будзе з намі? —
клінам свет.
Што будзе з ім? —
няўжо дарэшты?..
Гасподзь не ведае як след,
Гасподзь вядзе эксперыменты.

Вядзе, закружвае віццё
турботаў,
хмелю,
пуцявінаў.
І папярэдняе жыццё
усё глыбей,
у сарцавіну.

Адшчыкну вугельчык ад палена
перакідваць з далоні на далонь...
Замірае, дыхае нятленны
спадарожнік, продак мой — агонь.

Мінула, знікла...

І ў траве
прамень бязбоязна іграе.
Але мінулае жыве,
яно за намі назірае.

Ды ёсць яшчэ прастор далёкі
і сцежка — доўгая, бы ўздых...
Ты сам з сабой не адзінокі,
а між людзей: куды ж ад іх?!

Развей няведання туман
і адкажы нам,
непазбежнае,
ці гэта час належыць нам,
ці гэта мы яму належныя?

Я іх прыдумаў:
абавязкі!..
Я іх стварыў, я гаспадар,.
Мне надакучыла іх ласка,
іх непрадбачаны цяжар.
Не адпускаюць абавязкі.

Шукаем ісціну.
Сцюдзёна
яна ў азоне і ў вадзе...
Яе не знае здаволёны,
яна сасмяглага вядзе.

З дзівотнай вечнасцю ў хаўрусе
да супярэчнасцяў прывыкну.
Застацца каб! — не застануся.
Бясследна знікнуць бы! — не знікну.

Тут толькі лета і зіма,
світальны позірк,
сон глыбокі, і
белаплынныя аблокі,
і міг, што быў
і ўжо няма.

У гэтым лесе,
на гэтай зямлі,
нечакана безабаронны,
буду пакутліва ўспамінаць,
як падаюць дрэвы.

Спазнаць —
спазнаеш разважанні,
трактаты, дні, календары,
спазнаеш круг і скрыжаванне,
спіраль...
А ісціну — ствары.

Здасца, што ўсё ўжо было:
позірк, пяшчотны і чулы,
сонца ў лісці і крыло,
што ўвышыні мільганула.

Чые сляды засыпала пяском,
чые сляды травой пазарасталі.
Нібы мы памыляемся —
прырода
сцірае чалавечыя сляды.

Каб дачакацца,
не хапіла хвіліны,
каб назаўсёды расстацца —
хапіла якраз
хвіліны.

Прыйшла —
туман на мураву —
звінець,
ах, восень,
ганарыцца...
Сланечнік згубіць галаву,
празрыста ясень загарыцца.

Паміж дзвюма бяздоннямі
маўчання пульсуе думка —
голас пра маўчанне.

Людзі,
аблокі,
дрэвы,
з якімі ў мінулым расстаўся,—
няма да каго вярнуцца —
таксама з мінулым рассталіся.

Магчыма, выслалі лісты на доле
і напісалі птушкі на аблоках
фармуліроўку вечнага закону,—
адлёт і одум —
восень наступае.

Перакладаю шэпт дажджу,
пагляд вачэй,
трымценне гаю...
Кранаю,
слухаю,
гляджу,
я не пішу — перакладаю.

Няма звароту у маленства...
А хвалі — блізкая радня —
завабяць, знойдуць падабенства...
Але гняце нас глыбіня —
няма звароту у маленства.

Свет у аблозе навальнічных хмараў,
агеньчык у аблозе цемры —
крык не праб'ецца,
скамянее сказ...
Як выказаць цябе, маё маўчанне?

Перажыву —
і сны, і дзеі,
і шчасце (вышай галаву!..),
і здрады ўдар, і час надзеі,
і сэрца плач...
Перажыву.

Блакіт нябёсаў,

луг стракаты
больш не узрадуюць таго,
хто страціў сэнс.
Бо сэнсу страта —
то, пэўна, страта усяго.

Як пехацінец долу сціх,
уцяўся ў жвір,
ніхто, ніякі,—
перачакаць бы гэты міг,
уберагчыся да атакі.

Паміж усім на зямлі
дзве адлегласці:
паменшыцца адна —
павялічыцца другая...
Калі мы далёка — блізка,
калі мы блізка — далёка.

Вярнуць... вярнуцца б
познім госцем
у юны свет,
у маладосць...
А хто захоча ў маладосці
застацца гэтакім, як ёсць?!

Самыя грозныя пытанні —
простыя пытанні.
Іх вылепваюць дзеці:
навошта? чаму? калі?..
Ды сплываюць пытанні,
праходзяць пытанні,
застаёмся адны мы.
Пытанні былі...

Ляцяць —
праз леты... зімы...
о птахі,—
дзень і год...
Ім не зямля радзіма,
радзіма ім палёт.

Блукаюць сны
у лабірынце розуму,
і ў снах
блукае розум —
шлях людскі.

Прыкмеціць позірк
хмары і абсяг,
учуюцца зацішша, бездыханне...
І толькі думка,
вымкнуўшы маланкай,
знітуе ўсё
і рынецца ў бязмежжа.

Дарога дадому...
Усе дарогі,
якімі хадзіў і ездзіў,
убірае дарога дадому.

Выбіўся з рытму часу —
падаю
ў бездань часу.

Піць малако...
Не ведаць млосці,
не вандраваць па гарадах,
быць маладым у маладосці
і памяркоўным у гадах.
Піць малако.

Бядую: страта,
радуюся: страта...
Воўк-санітар —
нас насцігае страта,
і неадступна гоніць,
і ніколі
не ведае ні літасці, ні жалю —
усё слабое забірае страта.
Бядую: страта...
Радуюся: страта...

www.kamunikat.org

Аднойчы,
калі закончу ўсе справы...
О, колькі трэба зрабіць,
калі закончу ўсе справы!..

А стоміцца сонца, і неба
туман апануе густы —
акрыюць азяблую глебу
налітыя сонцам лісты.

І дрэва —
барва і прагалы —
лісты крамяныя свае,
якія ўчора ўберагала,
цяпер самохаць аддае.

Г олас клікаў —
таму прыходзіў...
Замаўкаў ён,
калі прыходзіў.

Чакаюць навальніцы хвоі —
а навальніца вызначыць абраных,
якія упадуць ад перуна.

Праз момант і праз век
вяртае рэха,
вяртае рэха слова,
думку,
жэст,
вяртае нас саміх...—
так помсціць рэха.

Дзіўная бітва —
з бязмежнасцю,
і дзіўны рахунак
у бітве з бязмежнасцю —
не перамогшы,
загінуць волатамі.

Век хуткасцяў, век паскарэння

www.kamunikat.org

хутчэй,
няспынка,
назусім...
У будучыню, у азарэнне,
мы, быццам падаем, ляцім.

Сярод усіх вятроў
адзін спадарожны.
Сярод усіх шляхоў
адзін незваротны.

Куды? Адкуль?..—
маўчанне.
Не дасць адказу час.
Стаю — і сам пытанне,
іду — і сам адказ.

Паўхвілі да ратунку —
і жыццё —
гады...
дзесяцігоддзі —
ўсё жыццё
знячэўку пераважвае паўхвілі.

Усё мы маем —
пільным вокам
акінь зямныя берагі...
Але адзін памрэ ад спёкі,
памрэ ад холаду другі.

Праб'ецца даўні запавет —
і стане цяжка,
стане дрэнна...
Але ўжо не марны свет,
і шлях, і клопат недарэмны.

Адменная чарга —
чарга дарогі,
восені,
задумы...
І нават выпадак,

і нават непазбежнасць
марудзяць
і пільнуюцца яе.

У вечаровым аўтобусе
чуваць урыўкі людскіх размоў...
Зрэшты, усе размовы
урыўкі чагосьці.

Кружацца ўвышыні буслы —
неўзабаве вырай.
Пазіраем на іх —
і паглядам адлюстраваным
бачым сябе.

Наведваюся ў мясціны,
дзе ўжо некалі быў,
і не ведаю, як растлумачыць
дрэвам, людзям, сабе самому,
што ўжо мяне двое,
і не ведаю, чым запоўніць
прагал паміж мною гэтым і тым.

Не сплю. Адліжна. Поле
туманіцца ў акне.
Міжчассе — ў наваколлі.
Міжчассе — ува мне.

Нікога,
хто ў тэты свет прыходзіць,
не абыходзіць доля:
атрымліваюць усе без вынятку
два найвялікшыя падарункі —
жыццё і смерць.

Спазніўся ўстаць
і спазніўся легчы,
спазніўся пачаць работу
і спазніўся скончыць —
і пачалі мяняцца
месцамі дні і ночы,

вынікі і прычыны,
і я апынуўся насупраць самога сябе.

Смерць косіць салому —
зярнят скасаваць не можа:
ратунак у лішку.

Карэнне і лісцё.
Бальшак жыцця зямнога.
Цябе сустрэне Ўсё,
а правядзе Нічога.

Як стары мудры вуж
шукае вузкае выйсце,
каб скінуць старую скуру —
так і я патаемнай вужовай натурам
шукаю сабе перашкоды,
хоць і пярэчыць гэтаму розум.

Гукаю цябе ў мінулым,
гукаю цябе ў наступным —
ты адгукаешся рэхам
майго гукання.

Сустракаюся ў думках з тымі,
каго няма побач.
Для кагосьці
і я таксама ўспамін,
для кагосьці
і я гэтаксама думка.

Час —
калі адна мэта
слухаецца другую.
Бясчассе —
калі замінае
кожная кожнай.

Такі рухавы малы:
амаль што выслізгвае са свету,
такі нерухомы стары:

свет амаль што выслізгвае ад яго.

Навокал праталіны.
І толькі тую сцяжыну,
якой мы заўсёды хадзілі з табою,
не адпускае зіма.

Сярод гамонкі анямець,
з паўтораў выбіцца,
з кружэння,
і — бы ўваскрошання — хацець
сабе не ўдачы —
паражэння.

Сяджу дома —
не падарожнічаю, не вандрую.
Падарожнікі апавядаюць
пра свае ўражанні і назіранні —
назіраю адно за імі.

За крок да ўдачы
спынюся,
за хвіліну да перамогі
паглыблюся ў одум...
Сябры ўздыхнуць і адыдуць прэч,
жыццё ўсміхнецца і спыніцца побач.

Усё мінае, - сказаў мудрэц,
і ўсе з ім згадзіліся.
Аднак засмяяўся непадалёку дзіцёнак,
і ўсе, азірнуўшыся, успомнілі:
і настае.

Снег растае.
Шкада —
і яго,
і сябе чамусьці.

Сакавік.
Усё паварочваецца ў наступнасць.
Праз чорнае голле блішчыць

востры маладзічок.

Вяртаюся да ранейшых размоў,
да ранейшых сустрэч,
магчымасцяў і абавязкаў —
каб узяць тое, чаго не ўзяў,
каб пакінуць тое, чаго не пакінуў.

Я — рака.
Цяку ад таго, дзе быў,
кім не стаў...
А яно даганяе мяне берагамі.

Калі твая будучыня
сумесціцца з будучыняю сусвету –
усе словы дарэчы,
усе ўчынкі да месца,
усе стрэлы ляцяць у цэль.

Азірнуўся —
нехта бяжыць па маіх слядах:
сухое лісце.

Адкрывае абсяг
думка-голас,
а думцы-бязмоўю
адкрываецца неабсяжнасць.

Асеннія хмары. Імжа.
Няма куды больш спяшацца,
няма куды больш паспяваць —
суцяшае дождж.

Выбег на сцежку
няўрымслівы дзьмухавец
і разгубіўся:
што будзе?!

Хіба іду зямлёй?!.
Іду сабой —
бесперастанна сцелючы пад ногі

свой цень,
свае намеры,
свае мэты.

Аблётваюць буслы зямлю кругамі,
каб увабраць яе ў сябе дарэшты
і скіравацца,
вольнымі ўжо,
ў вырай.

Дом знеслі.
Застаўся сад.
Як пастарэлі адразу дрэвы!

Людзі
глядзяць у будучыню,
мінулае —
на людзей.

У лесе пахмурым
бярозы —
белыя паланянкі.

Маленства:
пад шэраю глебаю
жоўты пясок —
радовішча залатое.

Ёсць лепшыя за мяне,
ёсць горшыя,
але сам я
ні лепшы, ні горшы —
адзіны,
угледзьцеся...—
чалавек
моўчкі кажа людзям.

Вулічныя ліхтары —
ці начныя сонцы:
той самы цень
ляжыць на тым самым месцы.

Каб зразумець сябе —
думка
дзеліцца ка дзве долі:
адна становіцца паляўнічым,
другая — уцекачом
і спасцігаецца,
калі гіне.

Стаю перад кніжнай паліцай,
гляджу,
не чапаючы іх,
на кнігі —
чытаю сваю душу.

Бабуля з пад'езда:
усё цяжэй ёй спускацца па лесвіцы,
усё цяжэй падымацца,
усё цяжэй заставацца дома.

Марафон:
бягуць
людзі навыперадкі
са сваім целам.

Адчыняю паштовую скрынку:
газета, часопіс, ліст...—
усё, што было і раней дагэтуль.
А кожны раз
чакаецца вестка.

Напярэдадні Новага года
шлём свае віншаванні-зычэнні небу,
а яно — ўсёй зямлі:
сняжынкі.

Дрэва:
крывыя галіны,
крылатае лісце,
скрытыя карані.

У дзедавай вёсцы:

гляджу на аблокі —
бачу людзей.

Пад шэрым небам
між шэрых палёў
зялёны агонь надзеі:
палетак руні.

Сосны: ўзышлі на самы
высокі пагорак
і вось разважаюць:
куды далей?

Той крок,
якім я не здолеў
ступіць напрасткі,
ператвараецца ў мноства крокаў
па крузе.

Блукаю
па горадзе незнаемым.
Ніхто мяне тут не спаткае,
ніхто не пярэйме,
ніхто не скажа:
ты сёння не гэткі, як звычайна.

Раніца.
Дворнік мяце тратуар —
ніяк не патрапіць
змесці свой цень.

Я там ужо быў,
і гэта я ўжо рабіў,
і тое ўжо зведаў...—
стаю сярод белага дня
з жыццём ашчаджоным
для невядомай справы,
для невядомай думкі
і для невядомага дня.

Канчаецца лета:

лісце
туліцца да галіны,
галіна — да дрэва,
дрэва — да каранёў,

Снег растае —
а тэтак
шмат абяцаў,
калі падаў.

Як бы ні мкнулася дрэва
у неба,
яно ўсё роўна не дасягае
неба...
Але, магчыма,
ніякага іншага неба няма,
апроч самога імкнення.

Калі ўсё наўкол
я ведаў на памяць,
тады ўзяў у павадыры
незнаёмага чалавека —
і сцежкі скрануліся і павялі
ў невядомасць.

На адну шалю вагаў
паклаў я хлеб,
на другую — камень,
але калі яны ўраўнаважыліся,
не змог
паверыць, што важыць хлеб
гэтулькі ж,
колькі камень.

Сцежка па-над абрывам:
па ёй прывабна ісці,
на ёй кожны крок
змястоўны.

Парастак, што прабіўся
праз пласт асфальту,—

усе пешаходы
табе саступаюць дарогу,
быццам вялікаму дрэву.

Дрэмле на летнім дажджы
спутаны конь —
спутаная прастора.

Праехаў з канца ў канец
увесь горад.
Трэба вяртацца:
прыпынкі
адлічваюцца наадварот.

Над небакраем акрэсліўся
жоўты ветах —
вушная ракавіна
нематы.

Думаў аб вечнасці.
Чорна-чырвоны матыль
прыляцеў,
сеў мне на руку,
стаў думаць разам са мною.

Скача па сцежцы
перад дзіцяцем
нязграбны вялізны грак:
не хочацца лётаць?

Што ўбачыў
я ў горадзе іхнім за дзень —
распытваюць гаспадары,
быццам самі
яны ўжо не могуць убачыць
таго, што ў ім ёсць.

Сярод красамоўных кветак
знямелы сівы палын:
ён адзін
чуе і разумее,

што кажа лёс.

Сівітае,
Першай убачыла гэта зорка,
што пагасіла сваё святло.

Стаю ў вялізнай чарзе.
Перш, чым з апошняга
стану першым,
пабуду ўсёю чаргой.

Летні раптоўны дождж.
Я прытуліўся
да ніцай вярбіны —
і мноства лістоў на мяне глядзела,
нібы здзіваваныя вочы.

Нехта назваў уголас
маё імя.
Хвіліна —
і зноў яно стала
тым, чым было заўсёды:
голасам цішыні.

Паслаў у прастору думку,
апамятаўшыся — другую...
Што робіцца зараз там,
у абсягах вашых,
думка-крумкач
і галубка-думка?!.

Старая бярэзіна
ля акна —
світанак,
што доўжыцца цэлы дзень,
што доўжыцца цэлую вечнасць.

Непрыкметны прахожы —
як ён стараецца стаць
яшчэ болыш непрыкметным,
каб людзі не заўважалі,

што ён зняможаны
і стары.

Заляцела ў пакой пчала —
зумкае,
б'ецца ў шыбу
і не знаходзіць выйсця.
Гэтак і мы?!.

Уздоўж начнога перона
такія самотныя ліхтары,
быццам прыйшлі
кагосьці праводзіць
і не могуць успомніць — каго.

Афарбавалі ў парку
замшэлы валун —
і памерлі
стагоддзі.

Зноў выпадкова сустрэўся
з адным выпадковым сустрэчным:
хіба
ён па-ранейшаму незнаёмы?

Пеўні,
пазвязваныя матузамі:
іх прадаюць —
а яны спяваюць.

Нехта надзвычай знаёмы —
быццам світала ўваччу —
набліжаўся насустрач.
Ах, тэта проста
жаночая прыгажосць.

Жывём пад высокімі дрэвамі —
вышэйшыя за саміх сябе
на вышыню дрэў.

Машыны глядзяць

вачамі людзей,
людзі — вачамі машын:
ці знойдзем
дарогу ў наступнасць?!.

Дождж напаіў зямлю —
і вочы
расплюшчыліся ў зямлі
і ўбачылі неба.

Стары мураваны дом:
становіцца ён з гадамі
усё больш адметны,
усё больш сапраўдны,
усё больш жывы.

Дзівосныя рыбіны — уначы
плаваем у бязмежжы, а ўдзень
блукаем па сушы, шукаючы ў ёй
рэшткі страчанага бязмежжа.

Паўрасталі ў зямлю
замшэлыя камяні
з незразумелымі літарамі:
на зямлі
нікога не засталося,
хто змог бы іх прачытаць?!.

Спрачаюцца людзі ў чарзе,
а ззаду,
за ўсімі,
стаіць самотнае неба
і ўсім уступае сваю чаргу.

У апусцелых дрэвах
пустое гняздо:
мінула,
пакуль яго ўбачыў,
лета.

Сярод зялёных кустоў

язміну і бэзу
зялёная лаўка.
Якой яна стане самотнай,
калі ападуць лісты!

У старажытным парку
раптоўна ўзляцелі
гурмой вароны:
нібы жывая істота,
ў галінах вагаецца крык
і ўспуджвае наваколле.

Які агромністы дом!..
Тут што ні дня
то свята,
а то жалоба.

Аркуш паперы —
аркуш жыцця:
забіраецца час,
збіраюцца знакі.

Усё змясцілася ў маім целе:
безліч вякоў,
безліч жыццяў,
а сам я —
не.

Яшчэ не світала —
прастукацелі па вуліцы
нейчыя крокі.
Пра што яны гаварылі?
Нешта і пра мяне.

Дрэвы ўскрай прорвы:
стаяць —
бы схапіліся ў бітве
з лесам.

Са старажытнага бору
насоўваецца змярканне.

Ці — старажытнасць?

У парасткаў-клёнікаў
такія ж сапраўдныя,
як і ў вялікіх кляноў,
лісты
і — такая ж сапраўдная восень.

Світае —
так паволі,
так неахвотна,
нібы засталіся на цэлым свеце
насельнікамі адно толькі
шэрыя камяні.

Прачнуўся ўночы:
па чорных дахах
кралася жоўтая поўня,
кагосьці высочваючы —
ці не мяне?

Зялёны мох на страсе —
песнаспеў зялёны
асенняму хмураму небу.

Да каменя прытуліўся
жоўты кляновы ліст —
хочацца стаць каменным?!.

У вокнах
запальваецца святло.
Хто праходзіць узбоч дамоў —
зазірае ў вокны,
хто ўнутры —
засланяе вокны.

Быццам само чаканне
увасобілася і стала
постаццю —
дрэва на гарадскім прыпынку.

Глухія завулкі.
Бляклыя ліхтары.
Хаваецца рэдкі прахожы
ад цемрадзі ў светлыню,
ад светлыні — у цемрадзь.

Застаўся вісець на сцяне
пажоўклы
леташні каляндар:
гэткія самыя дні,
гэткія самыя тыдні, —
а ўсё ўжо не гэтак.

Леташнія аб'явы:
чытаюць іх адно толькі
вецер і дождж,
пакуль
не прачытаюць дарэшты.

На небе ўзышоў
вусцішны,
даўні,
відушчы месяц —
і распазнаў мяне
ува мне.

Убачыў на вуліцы, у прыцемках,
чалавека,
надзвычай падобнага на майго —
ужо нябожчыка - бацьку.
О як мне хацелася
ўслед пайсці,
о як мне хацелася папытацца:
хто ён?!.

Акрыла наўколле шэрань:
кветкі паніклі,
камень зацвіў.

Кладка на гразкай дарозе —
нібы падае

руку незнаемы сябра.

Гусіныя крыкі
ў асеннім полі:
заўтра — зіма?

Абапал гразкай дарогі
белыя лапікі,
белыя іншасветы:
сляды зімы.

Над горадам,
дзе жыву,
падае светлы,
світальны,
вясковы
і заўтра ўжо тут не патрэбны снег:
заблудзіўся?!.

Справы,
якія здаваліся неадступнымі,
адступіліся...
Вось ты і вольны,—
сказала ўранку душа.
А ўвечары дадала:
і лішні.

Нібы святочная ёлка,
ззяе
вокнамі новы дом:
ці за кожным — радасць?

Зыпаў на досвітку снег:
бязмоўна
спявае наўколле.

Свеціцца
нізкае сонца ў вокны —
і постаці дрэў
блукаюць навобмацак
па пакоі.

Сам-насам з зімою:
вось і настала твая пара,
сутонлівая яліна.

Снег сышоў —
і ўзышла
леташняя трава.
І што мне з вамі рабіць,
шматкі мінулага часу?!.

Цягнецца з коміна
і растае
дым у паднеб'і —
сцежка,
што не варочаецца назад.

Па заінелым трамвайным акне
хтось напісаў:
«Я кахаю».
Усе пазіраюць на свет
праз гэтыя словы.

Над вёскай,
утуленай у зіму,
заззяла першая зорка...
І засталася яна ў душы
такой — неадлучнай ад зоркі.

Не спяшайцеся, кіламетры:
я ж яшчэ не прайшоў
гэты шлях
душой.

На снежным узмежку
калышацца ссохлы быльнёг:
ужо не пужае сцюжа?!.

Адліга.
Вяршаліны дрэў
намацваюць неабсяжнасць.

Падмерзла зямля —
стала суха,
сонца ўзышло —
стала слотна:
жыву — нібыта іду
па раздарожжы сусветаў.

Пачатак вясны —
сустрэча
усіх пораў года.
Хто яшчэ ходзіць у шапках зімовых,
хто — ужо ў летніх,
а хто — наогул без шапак.

Паляць у садзе
леташнюю лістоту.
Дым
лашчыцца да галінаў:
родны?!.

То хмары, то сонца...
І тэта ўсё,
што даюць нябёсы?!.
І гэта ўсё,
што чакаецца ад нябёсаў?!.

Чарнеюць на схіле
палосы і плямы:
аўтапартрэт агню.

Разводдзе.
Быццам чыясьці рудая шапка —
стог сена ў вадзе.

Не бойся, муха-нязграба:
хіба я стану сягоння
цябе чапаць,
калі зіма пражыта?!.

Падмерзла дарога:
нібы нерухомыя лодкі,

на ёй засталіся нашы
учорашнія сляды.

Стаіўся за дрэвам —
і для паловы свету
стаў толькі дрэвам.

Натрапіў у кнізе на захаваны
білет цягніковы:
не ведае ён,
дзе я быў,
не памятае —
куды ездзіў.

Вяртаюцца з выраю птушкі —
зямлі
вяртаюць нябёсы.

Каштан
у набраклых пупышках:
прыгожы
будучай прыгажосцю.

Садзяць бульбу: цяпер
думай сама,
турбуйся сама,
як выбрацца з гэтай сховы.

І табе ахвота
з усімі разам
пабыць на свяце вясны,
пякучая крапіва?!.

Сад атуляюць плотам.
А ён усё роўна
цвіце для ўсіх.

У ранку я выйшаў з дому
і ўвесь дзень ішоў
у кірунку да сонца.
Якім супярэчлівым аказаўся

мой шлях!..

Ці чуеш,
асушаная балацінка:
кнігаўкі прыляцелі?!.

Пачало неўпрыкмет змяркацца —
і неўпрыкмет
аціхла гаворка,
а ціша загаварыла.

Стаяць на балоце
стагі
з аснежанымі вярхамі —
тутэйшыя горы.

Рэчка замерзла.
Мост
здзіўляецца лёду:
адкуль ты ўзяўся?!.

Па непарушным снезе
лёгкі заечы след
і чалавечы —
цяжкі.

Ялінка на сметніку.
Вось і ўвесь Новы год!..
Вось і ўсё наваселле!..

Зімовае сонца.
Імкнуцца ўстаць
са снежнай пасцелі
цені.

Зіхоткая поўня —
акно,
з якога
глядзіць у душу нябыт.

Чакаем таксоўку ўначы:

чарга
пасунулася на адно месца —
і то весялей.

Зімовыя прыцемкі:
снег настае,
растае наваколле.

Вісяць між пупышак
замерзлыя кроплі —
таксама
вясны чакаюць?

Абудзіўся сярод суровых
зімовых палеткаў:
куды пацячэш,
ручай?!.

Які пахмурлівы небакрай!.
Адтуль
вясна надыходзіць.

Чырвоны дом на гары —
уволю
я ў ім нагутарыўся б
з цішынёй.

Бягуць ручаіны
у полі —
звівы
жвавай гаворкі.

Бярэзіна
і без лістоты,
шпакоўня
і без шпака —
пытанні, узнятыя ўгору:
ці не забыўся
пра іх сакавік.

Беляць у садзе вясновым

камлі —
галіны
самі пабеляцца неўзабаве.

Вісіць і не падае
у паветры
зялёны дождж:
ніцыя вербы зазелянелі.

Н е бойся цячы, ручай,
у яры і ў ямы:
рака
цябе не забудзе.

Вясновы самотны вечар.
Гуляе дзяўчынка
у хованкі з маладзіком.

Ля лазні
бярозы ў набраклых пупышках
і дзед-прадавец
з вязкай леташніх венікаў:
не спазніўся?!.

Гром загрымеў —
і адразу
аціхлі ўсе галасы:
нябёсы гавораць!

Першыя кроплі дажджу:
на плітах
азбука кропак.

Ладкуюць гнёзды гракі:
абламанае вецце
зноўку
вяртаецца дрэвам.

Здалечыні,
праз начную імглу
агеньчыкі замігцелі:

адзіны ва ўсім наваколлі дом,
што не спіць,—
бальніца.

Вішня наўскрай дарогі:
спяшайся
першаю расцвісці —
у пчол
абранніцай будзеш.

Кроплі дажджу
пастукаліся ў акно —
ці мо самі нябёсы?!.

Прарэзаліся на градках
стрэлкі цыбулі:
вачам дзівунак.

Ходзіць паважны грак
між квітнеючых сліў
па двары —
гаспадар,
што вярнуўся з замежжа.

«Даў Бог —
пражыла цэлы век,
а не ведаю,
у якім баку сэрца...» —
бабулі
ў царкоўным падворку.

Шчыміцца ў плот
цікаўная крапіва:
што тут,
у агародзе?

Вяду вясноваю вуліцаю
з бальніцы маці
сваю старую —
вяду
сваю старасць.

Бэзавы куст заквітнеў —
у доме
парасчыняліся вокны.

Крывенькая яблыня ў полі —
хоча ўцячы
з гэтага месца,
дзе пасадзілі?!.

Цвітуць на бальнічным двары
жоўтыя дзьмухаўцы —
уцеха
вачам чыімсьці.

Селяцца ў коміне хаты
вароны —
зрабіцца
чарнейшымі захацелі?!.

Калючы асот —
але вунь, глядзі:
пчала з ім сябруе.

Дом з каляровымі аканіцамі —
матылькі
разгарнулі крылцы?!.

Мокне на беразе возера
з вудай рыбак —
злоўлены язь
ловіць ротам дажджынкі.

Зона,
І як вы зайшлі,
бярозы,
туды — за калючы дрот?!.

Старыя дамы:
хацеў бы
зайсці ў кожны з іх,
у кожным

www.kamunikat.org

пажыць хвіліну.

Сеў матылёк на куст
квяцістага бэзу —
і ўбачылі ўсе адразу,
якi фiялетавы бэз,
а матылёк — бялюткі!

Паўзлазілі дзеці на дрэва:
дом,
што дарослымі не заняты.

Ледзьве відаць яго —
а запоўніў
сабою ўсё паднябессе:
жаўрук спявае.

Бульба цвіце.
У рамонкаў
круглыя вочы.

Вадасцёкавая труба —
увага,
што скіравана адразу
у неба
і ўдол.

Бярэзіна ўсохла,
а ў вершаліне
красуе зялёная амяла:
пераможца лёсу?!.

Каля зялёнага дрэва
скульптура з дрэва:
маўклівая спрэчка
пра дасканаласць.

У вёсцы.
Як дзіўна зноўку пачуць
гаворку,
знаёмую з немаўленства,

www.kamunikat.org

ад незнаемых людзей.

Ускрай маладога жыта
сінія васількі —
сінія буквіцы
ў кнізе лета.

Сохнуць на плоце збанкі:
штыкеты
займелі галовы?!.

Хаваецца між дамоў
зіхатлівая поўня —
цыганка нябёсаў.

Вецер павеяў,
закалыхаўся зялёны чарот —
і ўзнікла
р а з м о в а.

Перасяляемся.
У кватэры
селіцца рэха,
у рэху –
пражыты час.

Усё ў ім галініцца,
усё разнастайваецца,
усё
няспыннае паўтарэнне:
дрэва — ці, можа, само жыццё?!.

Косяць —
але ні для кога:
такі твой лёс,
трава-гараджанка.

Не замінайце,
ветахі-ліхтары:
дзіўлюся на поўню.

Па-над запруджанай вуліцай
лётаюць жвавыя матылькі:
машыны гэтак
не могуць.

У горадзе бор —
ацалелы гурт
упорлівых абаронцаў.

Навеялася да весніц
хваля пяску —
хваля мёртвага часу.

Спахмурнела —
і глыбіня
вярнулася наваколлю.

Канчаецца дзень —
у дрэў
выраслі цені.

Пад плотам
пасохлы дзядоўнік
і дзед-жабрак:
пабрацімы?!.

Шчасліўцы-вербы:
такая сухмень —
а яны з ракою.

Бяроза каля царквы –
дзве белыя постаці
прыгажосці.

Дождж!.. Дождж!..
І дзе ты быў усё лета?! —
плачуць сады.

Падаюць дзічкі ў траву —
і адтуль цікуюць:
ці хто іх возьме?

Старая таполя
з парэпанаю карою —
цякуць
па ёй ручаінкі часу.

Такая празрыстая далячынь –
відаць
нядаўняе лета.

Зграбаюць жанчыны ў кучу
апалае лісце —
і вось ляжыць перад імі
яно, быццам дзіўны
упаляваны звер.

Марудныя доўгія чэргі —
яны адны
яднаюць усіх сягоння?

Дождж церусіцца —
дым
не бачыць, дзе неба.

Згусціўся туман —
і вокны дамоў
сталі вачамі прасторы.

Якая прагная гліна!..
І з жабрака
сцягвае боты.

На скрынцы для смецця
цярпліва
сядзіць крумкач.
Раніца ўвосень.

На небе туман, н
а зямлі слата:
н а ш а  надвор'е?

Расклалі ля рынку

цяпельца
і грэюць рукі:
армяне ў Менску.

Ці калі-небудзь
сюды вярнуся?!.
За плынным акном
тасуюцца краявіды.

Снег усцілае зямлю,
на снег
сцелецца жоўта-барвовае лісце:
мастачка-восень.

Пад небам асеннім
калодзежны журавель:
скардзіцца, што не можа
лётаць?!.

Выйшла з аўтобуса
і азіраецца —
ці яе
гэты прыпынак:
старая перасяленка.

Над курганамі туман
ці дым
вогнішчаў старажытных?

Зіма ў лістападзе!.
У скутай рацэ
плаваюць качкі.

Убілася ў берагі
і заўзята
габлюе рачную плынь:
руплівіца-кладка.

У лужыну зазіраюць
познія дзьмухаўцы:
там — сонцы?!.

Вагаецца вецце
асенніх дрэў —
і вагае,
аплёўшы сваімі ценямі,
дом.

Адгарадзіўся ад навакolля
плотам з бярозаў і соснаў
і сам за імі
стаіўся:
лес.

Змяркаецца.
У парку крычаць вароны —
і крыкам намацваюцца,
што яны ёсць.

Такі прыгажун,
а зажураны:
неба не хоча
ужо ўсміхацца табе,
сланечнік?!.

Ветраны ранак.
З дрэў
цярушыцца лісце,
з вачэй
точацца слёзы.

Каменне ў затоцы,
сярод каменя
шэрыя качкі:
восеньскі морак.

Лужына.
Захапіла
жоўты кляновы ліст
і зашклілася лёдам:
е й н ы!..

Зрываецца і ў нікуды

ляціць лістота —
дарогу
паказвае мне?!.

Вострыць і вострыць дзюбу
аб камень крумкач:
ну, ляці ўжо,
досыць!..

Тулю да грудзей абярэмак
паленаў скалелых:
і ў нас
будзе нарэшце свята!..

Цягнецца з коміна дым
па-над снежным бязмежжам:
адна
сцежка — і тая ў неба.

Як паніжэлі
платы і вароты!..
Завулак
у снежных гурбах.

Зімовыя прыцемкі.
Да старой
бярэзіны папрырасталі
вароны — скалелыя камякі.

Збягаюць з дарогі
і пад сумёты
хаваюцца жвава:
змоўшчыкі-ручаі.

Чысты чацвер.
У вокны
стукаецца ўвесь дзень
клапатлівае рэха.

Лётае над красавіцкім
голым палеткам

першаю краскаю
матылёк.

Падпіў —
і трымаецца што ёсць сілы
аберуч за бохан хлеба:
стары вясковец.

Чмялінае свята:
зацвіў
куст вербалозавы
у наваколлі.

Пакінуты дом.
Зазірае ў акно
галінка зялёнай вішні:
няўжо нікога?!.

Блукаю па Вільні.
На даўніх мурах
новыя назвы.

Схаваўся ў царкву ад дажджу:
знянацку
зірнулі знаўпроць святыя.

Дзе — старасць,
дзе — маладосць?!.
Зацвілі яблыні сёння.

Збягаюць струмкі з капяжа:
у асфальце
ямачкі-чаравічкі.

І гэта адзенне?!. —
здзіўляецца клён: касцёл
у леташніх рыштаваннях.

Свецяцца свечкі ў траве:
дзьмухаўцы
абступілі сцежку.

www.kamunikat.org

Спеў у нябёсах,
нябёсы ў спеве:
жаўрук.

Боязна,
што заўважаць
і што не заўважаць —
таксама...
Суніцы зачырванелі.

Сярод залатых дзьмухаўцоў
адзін серабрысты:
у німбе?!.

Якімі высокімі павырасталі
быльнік і лебяда:
быў бы малым —
схаваўся б!..

Вось ужо й скончыўся лівень!..
А ліст кляновы лісту
перадае ўсе кроплі.

Далёка ісці...
Смакчу
няспелую сліву.

Вецце спусціла
ў замерлы ставок
і сама замерла:
вярбіна ў спёку.

Вуліцу заняло
паважнае шэсце:
ідуць
з пашы каровы.

Убіўся ў самую багну
і ўгору
узняў булаву:
аеравыя ўладанні!..

www.kamunikat.org

Хочаш са мной
паблукаць па свеце? —
Да рукава
бадзяк прычапіўся.

Хаваецца дзень.
У кожным
акне па сонцы.

Акрылася жабурэннем —
і неба
схавала ў сабе,
і з ім
схавалася ад паверхні:
затока.

З рынка нясу на руцэ
капусную галаву.
Ці ведаеш ты,
капусная галава,
колькі «зайцоў» каштуеш?

У ржышчы жытнёвым
конік застракатаў:
яшчэ
нешта не зжата?!.

Шэпчуцца:
ці застацца
стаяць у вадзе,
ці выйсці
усё ж на сушу...
Азёрныя чараціны.

Гронкі рабіны
зачырванелі:
ўгару
горнецца позірк.

Блукаю па вуліцах —
незнаёмец:

сонца то з левай рукі,
то з правай.

Снег у чырвоных лапіках:
выйшлі
з ракі чарадою
качкі.

Прыадчыніліся дзверы кавярні –
і зацвілі
у сцюжным паветры
пахі.

Слізка.
Хапаюся за
паветра!..

Шуфлямі ачышчаюць
ходнік ад снегу:
гук
рэжа паветра.

Ого, як ты ўмееш!..
Хапаеш хмызняк —
выкідаеш сечку:
аранжавая машына.

Што за пажар аблізаў
за ноч
навакольныя дахі?
Адліга.

Чайкі крычаць.
Падамся
на голас — магчыма,
дайду да мора,
магчыма, да акіяна.

Задубянелі:
надзеў на сябе мароз
памытыя апранахі.

Па геаметрыі дахаў
коціцца яркі шар:
зімовае сонца.

Спаборніцтва спрыту:
ў гармідар
звабілі качак,
ды чаек,
ды галубоў
хлебныя пачастункі.

Які пульхны снег!..
Гуляюць
дзяўчаткі ў снежкі.

Да чырвані ягадаў
і зелянiны лісця дадаў
таксама і снег свой колер:
усё ты маеш цяпер,
куст на Шарлотэнштрасэ.

За ноч перамог
усе воблакі, а цяпер
трэба з нябёсаў самому знікаць:
ясны месяц.

Размокла:
перадрукоўвае дождж
нанова газету.

У тым акне —
злева направа,
у гэтым — справа налева:
мкнуцца
гурмою аблокі —
і ўсе на ўсход.

Ля кірхі святога Міколы
спыніўся на момант
між голым дрэвам
і надмагіллем

з гатычнымі літарамі.
Адвячорак.

Сцяжынай дайшоў да ракі:
ні моста, ні кладкі.
Далей магчыма
ісці адно толькі
вадою ці — па вадзе.

Адліга.
Мяшаецца, што было,
што будзе.

Танцуе свой танец
і ў невымернасць
уцягвае свет
завея.

Падаюць кроплі з дрэва:
снег —
сіта.

Выпхнуў на ўскрай затокі
качак і лебедзяў ціхамоўчкі
нелітасцівы лёд.

Канчаецца студзень.
Паволі
мяняюцца месцамі
дзень і ноч.

Хоць шый з гэтых латак
апратхі!..—
ускуранелі
кляныя лісты: зіма.

Лёд на рацэ.
Падаецца
бераг да берага
у адведкі.

Здаволіўся.
Пазірае,
з кім падзяліцца піцай:
румянашчокі хлопчык
на Лімэрштрасэ.

Частка — пад лёдам,
частка — над лёдам:
палонны
чарот.

А летам тут любата!..
Пад паветкай
лаўкі — прытулак пусткі.

Адліга.
Вада
разводзіцца з снегам.

Вагаюцца цені ля вогнішча —
вырашаюць,
што лепей:
згарэць ці застацца?

У адной руцэ цяжка,
ну а дзвюма няёмка:
нясе ў калысцы-кашы
маленькая мама
дзіцёнка.

Начныя завулкі.
У гуку
пытаецца водгук:
«Хто тут?!.»

Выпаў у снег аловак:
цяпер
пішыцеся, вершы, самі!..

Ляцяць угору цукеркі.
У маляваных масках

www.kamunikat.org

блазнуе
і цешыцца з блазнавання
гановерскі карнавал.

Нагледзеліся на людзей?!.
Са слупа
здзіраюцца здаўненыя афішы.

«Цяпер і памерці не страшна»,—
гаворка
у новым тысячагоддзі.

Кратаю важкую клямку
зачыненай кірхі.
А звоніць!..

Адна адной падавалі
прысягі, што будуць
трымацца дарэшты разам?!.
Цагліны
старой камяніцы.

Прачнуўся ўначы.
Стукацяць
настойліва ўдалечыні
цягніковыя колы.

Зважыў
і шчодрай рукою яблык
дадаў звыш вагі:
гаспадарскія жэсты.

Крама адзення.
Зайшоў,
зазірнуў у люстэрка,
выйшаў:
на сёння досыць.

Вечар.
Адна за адною міма
праносяцца аўтамашыны —

доказы ў нейкай спрэчцы.

«Ці ў гэты бок дзьму?..» —
ў чарацінаў
пытаецца вецер.
Ківаюць: у гэты... у гэты...

Далека зайшлося.
Не хопіць
ужо, каб вярнуцца дадому,
дня.

Крэсліць на паваротках
крэйдай свае адзнакі
разносчык рэкламы:
сабе на памяць.

Паклалася ў рад
і — ў радасць:
чырвоная чарапіца.

«Ну а далей што?..» —
ў сяброўкі
дапытваецца сяброўка.
Дзявочыя таямніцы.

Вось так
і вось так!..— павучае
матуля дзіцёнка.
Аб лаўку вагона
стукаецца пярсцёнак.

У куксінах:
і калі
вы ўжо навучыцеся, як трэба
расці, гарадскія дрэвы?!.

Пацягне раз ён,
раз яна...
Дзеляцца між сабою
хлапец і дзяўчына

www.kamunikat.org

адной цыгарэтаю —
бы пацалункам.

Над дахам — маладзічок,
над дзвярыма — падкова:
бліскучая рыфма!

Гляне ў акно і зноў
схіліцца над чыімсьці
адзеннем кравец:
атэлье перашыву.

Снег і трава:
то яна наверсе,
то ён.

Высокія вокны:
адны
свецяцца самі,
другія –
маладзіком.

Змешваюцца з людскою
гамонкай
вароніны галасы:
гановерскае разнамоўе.

Цягнецца дым.
Труба
вядзе перамовы з хмарай.

Ходзіць штодня
тою самай дарогаю
і ўсё адно
нешта знаходзіць:
венік.

Жмурнее.
Далечыня
ўкладае сябе
ў сарцавіну рэчаў.

Накрапвае дождж.
У вежаў
спічастыя шапкі.

Так, так,— стукацяць
па бруку абцасікі.
Азірнуцца?

Прадвесніцца.
Дрэвы
ўслухоўваюцца ў вестку,
пні — ў немату.

Употай зірнуў на мяне
і тут жа
схаваўся за хмарамі:
дзённы месяц.

Ледзь ад зямлі —
а ўжо
адужвае леташкюю лістоту:
трава.

І трохі пагрэўся,
і трохі замёрз:
гараджанін
на першым сонцы.

«І што за пачвара?!.» —
крычаць
узбураныя вароны:
знікае
за дрэвамі верталёт.

Які іерогліф!..
Уклала ў яго вярбіна
свой жыццяпіс.

Крапае дожджык.
Ля плота мокне
леташняя трава.

«Бывай!..
Я вяртаюся ў горад»,—
сцежка
развітваецца з ракой.

Сонца ўзыходзіць.
Акно з акном
дзеліцца адлюстраваннем.

Стаілася ў зацені дома —
відаць,
чакае змяркання:
шэрань.

То снег,
то імжа,
то яснота —
адну за адною абноўкі
прымервае краявід.

Бэз у зялёных пупышках:
падрыхтаваў
вясне падарункі.

Спрачаецца з хваляю хваля:
цярпліва
іх выслухоўвае глыбіня.

Сонца ўздымаецца.
Цэлы дзень
будзе вучыць вас бачыць,
сляпыя пупышкі.

Сарваўся з таполі і зноў
вымкнуў угору:
грак
на паветраных горках.

На чорным — зялёнае,
на зялёным — зноў чорнае:
абвяргае паверхню крот.

Стукаецца нецярпліва
ў нязрушную брукаванку
дождж красавіцкі:
кліча
траву на спатканне?!.

Вясна на дварэ!..
У бульбы
цікаўныя вочкі.

Зрываюцца з веццяя
ў рачную плынь
важкія кроплі:
паспелі?!.

Пагодлівы вечар.
Стралою
імчыцца матацыкліст —
узрушвае вецер.

Кракае качка:
збягае
па стромкіх прыступках
голас.

Нямое загаварыла!..—
Зазелянеў
рунню палетак.

Мые акно гаспадыня.
Дождж
насоўваецца —
каб пасобіць?!.

Пайсці па чырвоным бруку
альбо па чорным?..
Пайшоў па абодвух:
дождж.

Вясёлка над горадам!..—
Зрок,

што бачыць усё
шчасліва.

І ў полі аб'явішся, крот,
і ў садзе:
цікава,
што на т ы м свеце?!.

То холад, то цеплыня.
Вароны — і тыя
гутараць пра надвор'е.

На шыбіне дажджавыя
кроплі— акенцы
бястварай увагі.

Лопаецца на каштане
пупышка:
ого як няпроста
вылузвацца з абалонак!..
Ведаю, ліст.

Ну, перагортвай!..—
чытае вецер
у скверы з дзяўчынай
кнігу.

Тут ён, дол, тут!..—
абвяшчаюць кроплі
наступніцам навіну.

На ганку Марткірхі сынку
завязвае мама,
укленчыўшы, чаравічак.
Нядзеля ў траўні.

Прыхінулася да вушака
і глядзіць
прадаўшчыца марозіва
на аблокі.

www.kamunikat.org

Вышэй і вышэй —
і калі ўжо будзе
відаць, навошта расці,
таполя?!.

Чмель адлятае.
«Ужо?!.» —
уздрыгвае кветка.

Еду на ровары
у невядомасць —
мінаю
квітнеючы рай.

Хто парушае
яе ціхамірную плынь?!.—
рака
абураецца вадаспадам.

Старая чыгунка.
Па рэйках
соўгаюцца мурашы.

Схіліў набок галаву
і дзівіцца на казюрку:
хіба яна варта тваёй увагі,
чырванагруды певень?!.

Чакаецца дождж?..
Няспешна
ідзе ўзбярэжжам ракі
пажылая пара:
у дол
упіраюцца парасоны.

Кірха-руіна:
гром
гутарыць з камянямі.

Бліскае.
У трапяткіх

трэшчынах вокны.

Цокаюць звонка
падковы па бруку:
на годных конях
годна сядзяць і ловяць
усеагульную ўвагу
гановерскія паліцыянты.

Узяў і аддаў:
заняты
сапраўднаю справаю
экскаватар.

Цяпер мы амаль аднагодкі!..
Стаў на калені —
гуляю з дзіцем.

З важкай аздобай
ідзе праз пляц
паважная гаспадыня —
са звязкай ключоў
на шыі.

Скончыўся дождж.
Цякуць
адкінутыя адлюстраванні.

І сонца ўзышло,
а ўсё роўна свеціш,
неслух-маладзічок.

У Залатым завулку
даносяцца з кірхі
гукі аргану:
іх галубы ўхваляюць,
шпакі пераймаюць,
а вераб'і выказваюць наконт іх
крытычныя меркаванні.

П'е піва,

чытае газету:
на ганку
сядзіць гаспадар.
Заслужаны адвячорак.

Дзве маладзіцы на развітанне
дорaць адна адной
пацалунак:
у звечарэлым сонцы
свецяцца вусны.

На камень каля стаўка
прымасціўся крумкач:
слухае жабіны песнаспевы.

Не будзеш хваліцца цяпер,
хмарнеча,
што ты — нябёсы.
Раптоўны вецер.

Лодка ў рацэ:
палова — ў адлюстраванні,
палова — ў люстэрку самім.

«Хай толькі падступяцца!..»
Грозяцца хвалям
з берага важкія камяні —
антыхвалі.

Паспела —
й займела душу?
Ў жоўтай грушы
гаспадаруе аса.

Брама на могілках.
Колькі
людзей упусціла!..
Выпусціла колькі?!.

Сціраецца горад:
у абяцанне

ўкладаецца далечыня.

Цяціва напялася,
З мноства імгненняў
вылучы зараз адно і злучы
з мэтай,
бясхібна абранай,
гановерскі лучнік!

Ідзе, зазірае ў вітрыны
і ловіць
свае адлюстроўванні:
прыгажуня?!.

Яблык упаў.
Шукае
галіна ранейшую раўнавагу.

Сонца зайшло,
а камень
дыхае цеплынёю:
удзячная памяць.

Ветраны дзень.
Атуляе
цішай намоленаю
Маркткірха.

Па-над чырвоным дахам
узнесла ўрачыста рабіна
чырвоныя гронкі:
восень.

Сонца скупее.
І тут, і там
агінаю цені.

Ноч і чыгунка:
жалеза
грукае аб жалеза.

www.kamunikat.org

Не выпусці!..
Над слатою
вецер нясе маляўнічы
кляновы ліст.

Дыхнула першаю сцюжаю:
кожны
ліст сам.

Вітаюцца між сабою
праз шкло вітрыны
знаёмыя гаспадыні:
уголас,
ды безгалоса.

Дубовая бочка.
Пабачыць —
і то прыемна.

Трохі раней ці пазней —
сцярушыць
і з клёну, і з ліпы
лісты лістапад.

Нізкае сонца.
Зямлю
засяляюць цені.

Вуліцы з бежанцамі:
шукаюць
лісты прытулку.

Імглою вачэй
узіраецца праз акуляры
ў імглу адвячорка:
бабуля.

Быльнік у шэрані:
у навіну
гэтакая аздоба?!.

Сваe лісты разгубіў,
затое
займеў кляновы:
ці вартая мена?
Вартая, хмыз!..

Блукаю сцямнелымі вуліцамі.
З вітрын
глядзяць узорныя людзі.

Вяршаліны пакруціла,
а лісце не падмяла —
не яе работа:
віхура.

Свеціцца пустатою
кавярня ў імгле:
зайду,
парадую гаспадыню.

Лісты — у апёках:
з марозам змагаецца
крапіва.

Вяду з сабой
мглісты месяц.
У згадках
колішнія паэты.

Рана змяркаецца.
Са старою
бярэзінаю сарока
дзеліцца нейкаю навіной.

Звон зазваніў:
прастора
займела цэнтр.

«Цяпер і падужацца можам!..»
На вецер скінуў
аздобу сваю

дзьмухавец.

Спякота.
Хаваецца цень
у дрэва.

Пачакай, не знікай,
белая аблачынка;
мы зноў
сустрэцца не зможам.

Круціць на рынку
катрынку васпан:
разглядаюць
наўколле гукі.

Галоўнае — не выстаўляцца!..
Між шпал
разлапушыўся трыпутнік.

Апоўдні.
Высокімі галасамі
выкрыкваюцца на рынку
кошты спаржы.

Пад каланадай нязграбна
дзяцюк прымярае шапку з
 бліщчастай кукардай.
«Пасуе»,—
ківае крамнік.

Павеяла прахалодаю:
шле
рака прывітанне.

Коціцца і бразгоча
па бруку бляшанка:
вясткуе буру?!.

Парожнія сумкі:
шпарка

едзе на ровары
паштавік.

Нават старая сасна
падала свой голас:
музыка-дзяцел.

Узняў ганарліва
свае шышакі:
глядзіце —
і ён з ураджаем!..
Лопух.

Глянула —
і са мною
схавалася ад мяне
яшчарка ў схову.
Бязлюдны хутар,

Наставілі вушкі
за шклом вітрыны
файныя кубачкі:
мо хто возьме?!.

У двух абдымаем
вячысты дуб,
трэцяга не хапае:
каго паклікаць?!.

Сонца зірнула —
і ў скрынцы
вулічнага прадаўца
зазалацелі пярсцёнкі.

Дождж:
возера
ў акупунктуры.

Бліскае.
Едзе гром
па вогненных рэйках.

Перамаўляюцца цераз дарогу
дзве маладзіцы:
машыны
з размовы выхопліваюць кавалкі.

Дажджыцца.
У каласах
зярняты — слязіны.

Давай паплывем!..
Рака
падмывае бераг.

Сонца заходзіць.
Куды-куды
над зжатым палеткам
спяшаешся, матылёк?!.

Куча пяску:
расце
углыб і ўгару паверхня.

«А вось яшчэ што!..»
Нанова
ўсчынае размову
асенні дождж.

Возера.
У адлюстраванне
падае ліст.

«Дзе мае плёны?!.»
Точыцца скрозь
у шчыліны восень.

Ну хоць бы хто зачапіў!..
Ля сцежкі
шыпшына ў шыпшынінах
пераспелых.

Дол у жалезе,

у срэбры трава:
навіна
ўсялілася ў наваколле.

Дзе яны, ўсклікі?!.
Ляцяць
над небам сцямнелым
гусі.

Хапаецца за каменне
бурлівы ручай:
няўжо
я ўжо дабег да мора?!.

Лісцё ападае.
Лес
падаецца ў вырай.

Кідаю ў кантэйнеры
слоікі і бутэлькі:
то белы дасць звон,
то зялёны...

Цямнее:
пара
запальваць ліхтары.
Цяжчэе:
пара ўсміхацца.

Нехта павінен прыйсці?!.
За ноч
аздобіла сцежку шэрань.

Махае за плотам
лістотаю бэз:
адчапіся, сцюжа!..

Ну хто яшчэ здолее так?!.
Па вадзе
бяжыць і сабой ганарыцца
качка.

Куды вы?!.
Плывуць аблачыны:
над голым гаем
бухматыя шаты.

Выпхнуліся на сушу
і ў сон
уклаліся ніцма:
лодкі.

У снежным бязмежжы:
прагалы —
людзі.

Шчэміцца ўслед за мною
у кірху кляновы ліст:
на вуліцы нецікава.

Сцежкі расслізгваюцца:
ідзе
зіма ў адпачынак.

Кропка і штрых:
іглічка
трымае кроплю.

І гэта не тое,
і тое не гэта:
з вядра
выкідвае смецце варона.

З дахаў пазвешваліся ледзяшы:
трохі яшчэ —
і дацягнецеся да долу.
І першы промень табе,
і апошні:
мясцовая кірха.

І гэта работа!..
Цалюткі дзень
стаіць манекен каля крамы:

www.kamunikat.org

ў кішэнях рукі.

Спазняешся?!.
Без дарогі
спяшаецца некуды
еташні ліст.

Ходзіць і працінае
сваёю дзідай
шматкі каляровыя і бляшанкі:
смяцяр-ваяр.

Зацвіў —
і зрабіўся
усім знаёмы:
бэзавы куст.

Між высветленых вітрын
дзве негрыцянкі ўзнёсла
нясуць сваю прыгажосць.

Імклівыя уверцюры!..
Па мосце
праносяцца цягнікі.

Дождж усчынаецца.
Гладзіць матуля
дзіцёнка па галаве.

Дорыцца гэтаму і таму
сонечны зайчык:
дзяўчаткі
на школьным ганку.

Людна.
Прымерваю на сабе
шматлікія постаці і абліччы.

Піша нястомна
ссохлая чарацiна
ў паветры свае пісьмёны:

зялёным у павучанне?!.

Які маляўнічы водгук!..
Сасна
на ўзбураным узбярэжжы.

Лёткія ластаўкі:
з гукам гук
звязваецца ў ізаглосы.

Вяселле ў завулку.
У грыву каню
ўплятаюць дзяўчаты стужку.

«Так доўга цябе не было!..
Сцяблінка
выжальваецца лістку.

Парушаны мур.
Упарта
трымаюцца камяні
за даўнюю веліч.

Полымем,
дымам
і попелам,
як і раней,
яднаюцца дуб і бяроза.
Дома.

Бліскучае шво!..
Зіхаціць
у хмарах маланка.

Таксама ў аздобу?!
Над навагодняй
ялінаю свеціцца
маладзік.

Педзе чакае:
шукаю

у горадзе верш.

Туман:
у наўколля
кружыцца галава.

Жабрачкай ля сцежкі
чапляецца за рукаў:
«Што маю — вазьмі!..» —
Шыпшына.

Вецер:
былінка
горнецца да былінкі,
а тая — ад.

Шкло запацела:
далонню
адтульваю далечыню.

Туманныя прыцемкі.
Ліхтары
ўглядаюцца ў твар гаворцы.

Хопіць на ўсіх:
імжа —
дотык, рассеяны ў наваколлі.

Бягуць і вітаюцца:
«Grüezi!..» —
жанчыны
з ліхтарыкамі ў галавах.
Найноўшыя адвячоркі.

У снезе даліна,
у пацерках арабіна:
свята
адна адной.

Вузкі завулак —
ледзь размінуцца:

насустрач
сляпы манах.

Схавалася сонца:
хмара
займела скарб.

Рыфмы і рытм:
ручай
гутарыць з камянямі.

З кім пазнаёміўся —
пазнаю
ў сустрэчных то Ганну,
то Эвэліну.

Згасае за небакраем
чырвоны пажар:
наваколле
у попеле — ў змроку.

Што дзе было?
Дзіўлюся
заплюшчанымі вачамі
ў мінулы дзень.

Махае хаціна
хусцінаю дыму:
дома?!.

У хвалях яліна:
перадае
галіна галіне вецер.

Іду невядомай сцяжынай
за невядомай жанчынай:
некуды —
а прывядзе.

Прабегла па вецці
белая бліскавіца

www.kamunikat.org

і засталася:
раптоўны снег.

Завея:
на левы бок
выварочваецца прастора.

Снежнае неба:
ляціць аднекуль
некуды чорнай
адтулінаю крумкач.

У руху і ў постацях:
завіруха
збірае наўколле.

Зляпіліся і грамадою
глядзяць на дарогу
людзі са снегу:
што будзе?

Звоніць упоцемках звон:
куюцца
з імгненняў гукі.

Разуўся — і босы
ідзе па снезе:
зімовы дождж.

«І што мне рабіць з ім,
з дарункам гэтым?!.»
Трымае яліна
на кожнай галіне
па булцы снегу.

Скідаю пальчаткі:
цалуе
рукі мароз.

Усе тут былі:
маўчанне

гутарыць з пусткай.
Вакзальны ганак.

Нячутна прыйшлі
і пайшлі бясследна:
цені на снезе.

Выходжу з дзвярэй —
завіруха
хапае ў абдымкі:
рада?!.

Нападала снегу.
Дрэва
пытаецца ў дрэва:
«Хто ты?!.»

Што гэта робіцца?!.
З глыбіні
дзіваяцца рыбы:
цяпельца
расклаў на лёдзе рыбак.

Круціцца ў полі спіраль:
завіруха
уцягвае свет у бездань.

Пярсцёнкі зпучаюцца ў ланцужкі:
ручай
бяжыць і гамоніць.

Спевы ўначы:
блукае
ля кірхі вецер.

І як ты тут апынуўся?!.
Па снежнай гурбе
блукае кляновы ліст.

Схаваў галаву ў азярыну –
не хочаш слухаць,

што кажа табе крумкач
з галіны голага дрэва:
лебедзь.

Манета на ходніку:
драбяза,
а выпадак у дарунак.

Нліна ў слязінах:
дарэмна
падаеш, снег?

Кідаюцца снежкі:
усім цікава —
унуку,
бабулі
і ручаю.

І поцемкі, і святло,
і нешта
яшчэ: атуляе
зямлю адліга.

За ноч аваладаў
усёю акругаю:
снег —
прыгожая перамога.

Што сніцца вам —
сонца?
Дровы
пакладіся ў шталагі:
грэю позірк.

Завея.
Глядзіць у вірлівы змрок
і мне махае рукою
акно манастырскае:
сястра Ганна.

І прыляцелі, і селі

на лапках яліны
першыя прыцемкі —
птушкі ночы.

Нешта не так?!.
Адліга
перамалёўвае краявід.

Накропвае дождж:
з парасонам
вітаецца парасон.

І вабяць, і мігацяць
агні
на тым баку возера:
у нерухомым
палёце ноч.

Схаваў галаву ў капуцын,
а далоні
падставіў дажджынам:
манах, прадвесне.

Прабегла залева.
Слядамі
перадрукоўваю брук.

Свеціцца свечка —
просіць,
каб адступіліся ліхтары:
уваходжу
у велікодную ноч.

Так доўга ляцела —
і прыляцела!..
Скача
ля шышкі хваёвае верабейка —
тлумачыць,
што тут і як.

Заварушыліся валуны?! —

Да першай
травы прыпалі
баран і авечкі.

Піша вясна ў паветры
гучныя гукасловы:
на плітах
вароніны кляксы.

Што там, за плотам?..
Лічаць
мяне то штыкецiны, то прагалы.

Узняў галаву з-пад крыла
і абурыўся лебедзь:
неспадзяванкай
маю сябе,
небяспекаю маю.

Суцэльнае вуха:
слухае пень,
што кажа сарока.

У гэтульки нітак!..
Сшывае
зямлю і нябёсы дождж.

І срэбраны злітак,
і залаты:
азярына
ў алхіміі адвячорку.

Свята ў двары!..
Цалую
чмялём і пчалою вішню,
што першаю зацвіла.

Тварам да сонца
іду ад сонца;
што хочаш,
тое і думай, цень!..

www.kamunikat.org

Стала ў дзвярах
і чакае,
каму яна дасць дарогу:
спадарыня кнайпы.

У залатых каронах
прынцы прыйшлі
і казку
з сабою прынеслі:
пагорак у дзьмухаўцах.

Дождж даганяе,
дзяўчына ўцякае:
хто першы
адолее вуліцу?!.
Разважае
ў тры розумы светлафор.

На шыях званкі:
складаюць
сімфонію лугу козы.

Вось дзе яна!..
З крапівою
вітаюся —
рукі купаю
ў зялёным агні.

Косы да пояса:
гожым рухам
дзяўчына ўзмахвае галавой.

Грукае гром —
у прадчассе
перакшталцоўвае час.

Між кляштарам і цвінтаром
хусцінкай
паслаўся туман
і знікаць не знікае:
блакітныя незабудкі.

Сонца заходзіць:
у двое вачэй
узіраюся ў трэцяе вока.

Чыстае неба.
Паміж гарамі
нацягвае шнур самалёт —
каб сушыць аблокі?

Узнікла і знікла:
тлумачыць
маланку гром.

Рака разлілася:
плыве
шызая качка сцежкай.

Чытайце навіны!..
Бяжыць
бязлюднаю вуліцай
вецер з газетай.

Узняўся —
гляджу з узгорку
на яблыню ў квецені
і на кагосьці,
хто мною быў.

«Хто злева,
хто справа,
а я ў самым цэнтры»,—
сцвярджае
трэшчына на сцяне.

Глядзяць у начное
акно ліхтары:
і колькі
вас у мяне ўсіх, цені?!.

Я ўгору,
яна з гары,

www.kamunikat.org

усмешка — сустрэчаю:
незнаёмка.

Воплескі:
узлятаюць
лебедзі з азярыны.

Дужыя коні!..
Карэта
коціцца вуліцай —
з даўніны.

«І што вы хаваеце ад мяне?!.»
лапушыны
выпытвае дождж.

Не ўмею гэтак сабой,
але ўмею імі:
дразды
высвістваюць ноты.

Што там?
Нічога.
А не адводжу
ад звечарэлага неба
позірк.

Апранута ў выбух —
з узгорку ляціць
груша расквечаная
ў бязмежжа.

Гром адмыкае радовішчы:
у краявід
разгортваецца навальніца.

Сабе ад сябе?!.
Чырванее
ў руках у манашкі
цюльпан.

І зверху вада,
і знізу вада:
пахавалі
галовы качкі.

Ловіш навіны?
Слімак
выставіў рожкі.

Вецце — грымоты,
камель — маланка:
сасна
спрачаецца з навальніцай.

Пазвешваліся цераз плот
ліловыя гронкі:
хочаш
са мной пазнаёміцца,
бэз?!.

Вагаецца воблікамі —
вядзе
возера з воблакамі
размову.

Цёмныя вулачкі.
Зазірае
у шчыліну неба ветах —
дапытлівы вартаўнік.

Той з дымам,
а той з агнём:
каля плота
з даўгманымі цыбукамі
натоўпяцца дзьмухаўцы.

Босай нагою ручай
кранае жанчына:
лета.

Скокнула з кладкі жабоцька:

дадому
дае дарогу.

Чакаю і чую:
над галавою
грукоча то гром, то цягнік.
Пад мостам.

«Амерыцы кранты!..» —
два мінчукі
даводзяць адзін аднаму
каля ганку крамы.
Свая гаворка.

«Баба ці дзед?!.» —
з дзьмухаўца
здзьмухвае вецер пушынкі.

Хваля да хвалі:
арэ
возера вецер.

Глыбокае рэчышча.
Карані
кранаюць за рукі:
«Хто ты?!.»

І не хацеў бы, а вабіць:
нашто
я табе здаўся,
яма?!.

Сонца заходзіць:
жарыны —
сосны.

Людзі — сустрэчы.
Перажываю
нейчыя жыцці:
хвіліна — і досыць.

Такую карціну —
і не заўважыць?!.
Дарожны рабочы
малюе чырвоную паласу.

Сонца заходзіць:
выходзяць
навобмацак з лесу цені –
нейчыя павадыры.

Вымкнулі з позірку
і памкнулі
дзве каляіны:
сустрэнуцца — знікнуць

Раніца.
Гракае грак —
сшывае
час і прастору
суровай ніткай.

Схіліўся над вежаю —
выклікае
са сховішчаў здані:
срабрысты месяц.

Які пацалунак!..
З гладышкі
жанчына п'е сырадой.

Пазнала здалёк:
у завулку
бярэзіна —
усюды-вестка.

Ці ёсць хто тут?!.
Затрапятала
полымем свечка
і рэхам
азвалася ціша:
апліца ў гарах.

Верасень.
Свяцяць з лістоты
ліхтарыкі —
жалуды.

Усё тое самае?..
Наваколле
ператлумачвае дождж.

З лета — у восень:
плыве
над голаю пожняю
павуцінка.

«Нашая хата
намі багата»:
паабтулялі
апенькі пень.

«Я лішні?!.» —
у наваколля
пытаецца дзьмухавец.
Халоднае сонца.

Нешта шукае,
а што — не ўспомніць:
блукае
у полі дождж.

Хоць нехаця, а абдымае
агонь галіны:
у пустцы імжа,
у імжы цяпельца.

І заржавеў,
а ўсё роўна
трымае ранейшае перакананне:
ланцуг.

І тут вяршыня,
і тут!..

З гары
коціцца камень.

Цямнее:
кудысьці
знікаюць хаты,
адкульсці
глядзіць зіма.

Што мае — хавае:
плыве
над горадам хмара.

Набрала і да грудзей
прытуляе: рада
дзяўчыка
і булкі рады.

Голае поле.
Таполя
у згашаных бліскавіцах.

Апошні — і лішні:
пад плотам
стуліўся снег.

То выгляне з-за сасны,
то з-за голага голля:
усюды ты дома,
маладзічок.

Зялёнае дзіва:
скубе
траву гусянятка.

І звоняць званы,
і грукаюць перуны:
маланка
пайшла сустракаць Вялікдзень.

Сюды і адсюль:

на плынь
пакладася кладка—
збірае мыту?!.

Пралескі цвітуць.
У капліцы
адчынены дзверы.

Тут усё добра?!.—
З пупышак
бярозавых выглядаюць
у свет лісты.

Запальвае свечку ад свечкі
сястра Тэрэза
і мне падае:
трымаю
малітву агню.

Лопае крыллем
і ручаінай
ляціць нейкі птах:
ах, сама ручаіна.

Бязлюдны прыпынак.
Ківае
галінкай зялёнай вішня.

Рог затрубіў у гарах —
лагчына
ўздымае голаў.

Тут дуб,
там бярэзіна:
пераходзіць
вясна памежжа.

Курадь напару:
хапае дым
з вуснаў дзяўчыны вецер.

Выглянула з-за хмараў —
і набыло
мэту наўколле:
да сонца з сонцам!..

«На табе!..» —
Падаюць
адна адной рукі бабулі:
не бачыліся сто гадоў.

У слёзах:
усыпалі дол
яблыневыя пялёсткі.

Ступіў на той бок,
а на гэтым спыніўся:
над ручаінай —
масток.

Справа ружовы бэз,
злева белы...
«Каторы бліжэйшы?» —
пытаецца прыгажосць.

Спачатку насустрач,
а потым разам!..
Хапае
фантан у абдымкі дождж.

Хаваецца дрэва за дрэвам
і за сцяною сцяна:
гуляе
у хованкі краявід.

Хто першы?!.
Над сцежкай
напнулася павуціна.

Варушыцца куст:
усяліўся
у постаць вецер.

www.kamunikat.org

Хваля на хвалях:
плыве
качка ў сутонне,
ў світанак — лебедзь.

Кінула недапалак
на брук дзяўчына
і затаптала абцасам:
так яму й трэба,
аматару пацалункаў!..

Ён праганяе,
яна спыняе:
о ружа, о дождж!..

Думкі — аблокі:
гара
ўглядаецца ў заўтра.

І галавой, і хвастом
матляе
на пасвішчы конь: таго,
хто бачыць яго,
вітае?!.

Дык тут цэлы свет!..—
Уздымае
з-за агароджы сляпой ліхтарык
асот.

Бяжыць — а на месцы:
яліны
удумваюцца ў ручай.

Аблокі і сонца:
з рамонкам
знаёміцца матылёк.

Бязлюдны паўстанак.
Ва ўсе бакі
разгортваецца бязмежжа.

www.kamunikat.org

Стала на пень
і тое, што прамаўляла
учора людзям,
цяпер прамаўляе ялінам:
Урсула Урст.

З хлебам у дзюбе:
схапіла і паляцела
абы-куды чайка.
Гармідар ззаду.

Лічыць дажджыны трава,
а сквар
злізвае: ліпень.

Даткнулася ценем
і адышла
далей датыкацца:
дзяўчына.

Што там, за імі?
У дрэў
прывідныя аблiччы.

Выспалася?!.
Паўстае
з возера выспа.

На рынку:
паказвае год
людзям свае малюнкі.

Зірнула,
ўсміхнулася,
пацалавала
дзяўчына люстэрка:
свята,
якое заўжды з сабой.

Белыя караблі —
заплылі

у мора блакіту аблокі:
мо з мэтаю?!.
Мо без мэты?!.

Завулак у пнях,
на пні
паклалася ежа:
ў пільцоў
абедзенны перапынак.

Апосталы глыбіні —
выходзяць
з возера валуны:
дзе дно — там плытка?!.

І сонца, і дождж:
святкуе
трава сустрэчу.

Дзе захад?
Дзе ўсход?
Абдымае
вятрак прастору.

Хто яны мне?!.
Знікае
паволі аўтобус:
у тварах вокны.

Каб падымацца і апускацца:
ў нахіл
нейчымі целамі
ўкладзіся пліты —
маім таксама.

Застракатала сарока;
збірае
гукі туман.

Падае шышка з хваіны;
наставіў

далоні дол.

Ліпеньскі сквар.
Да ног
лашчыцца возера:
«Я з табою!..»

Дзядоўнік зацвіў:
займелі
чмялі амбасаду.

І ў кожным
я нешта забыў?!.
Збіраю
ў сустрэчу аблічча.

Спярша запярэчыць,
тады захопіць
і адпусціць не захоча:
ажынавы куст.

«Хочаш напіцца?!.—
Гуляе
хваля з галубкаю,—
Вось я, пі!..»

Тралейбус спыняецца.
Саступаюць
людзі ў імглу:
я з імі.

То скіне з нагі чаравічак,
то зноў абуе...
Пад каланадай
глядзіць у вочы
выпадку незнаёмка.

Счэрпваю з кветак
кепкай расу:
Рарон —
слёзныя сувеніры.

www.kamunikat.org

Зайшоў за вароты
і з-за варотаў вярнуўся:
быццам кагосьці, з сабою
прывёў сябе.

Гамонка змывае гамонку:
там вуліца,
тут ручай.

«Вось я!..» —
Ўвабралася ў радасць
і ўсім
дорыць яе рабіна.

У горадзе мур:
з адтулін
цэліцца даўніна.

Быццам нічога не здарылася –
між сабою
гутараць местачкоўцы:
а я
заблудзіўся!..

Нешта заўважылі?!.
Над ручаінай
лётаюць жвава стракозы —
з біноклямі ў галавах.

Даткнулася:
мыю твар
світальнаю павуцінай.

У сінім:
абсягі
займае далечыня.

Варта за вартаю:
прапускакщь
у горад ручай
валуны.

Пасоўваецца ўзбярэжжам
сямейная пара,
сабака наперадзе:
дырыгуе?!,

Сонца хаваецца.
Да акна
паварочваецца сланечнік.

Жвавяцца за драцяной
агароджаю птушкі
у маляўнічых уборах,
а — апускаю вочы.

Паспеў —
у свабоду
зрываецца з клёна ліст.

Бязмежжа згусцілася:
карабель
гудкамі абмацвае наваколле.

Грэецца ў бабіным леце:
босы
на камені след.

Зайду —
апрануся ў стагоддзі:
чакае
ля вежы дзень.

І ты сярод іх!..
У затоцы
плавае сярод качак
і лебедзяў жоўты
кляновы ліст.

Сонца хаваецца.
У людзей
прыгожыя твары.

Ад сёння нічога не застанецца?!.
Мяце
ходнік прад кнайпаю
гаспадыня.

Трава на асфальце.
Пакуль стане сенам,
яе не стане:
авечкі, праўда?!.

Аўтадафэ.
На ўзгорак
выйшлі бяроза і клён:
гладзіце!..

Быў бы дзіком —
займеў бы
спажытак: па жалудах
бадзяецца вецер.

Займелі вагу:
ў павуціну
уклаліся кроплі.

«Дзе той капуцын, якога
я некалі бачыла тут?..» —
Зазірае
мне ў твар старая.

У гутарцы:
то з таго,
то з гэтага дрэва злятае
барваны ліст.

Словы згарнуліся ў немату –
у раллю
уклалася лета.

Знасіліся чаравікі:
рады,
што вызваляюцца ад мяне?!.

Паклаўся на пень
залацісты ліст:
нешта
намерваецца папытацца?!.

З'еў цені,
з'ядае твары:
туман
на вуліцах і ў завулках.

У чорным, з пазнакаю белай —
углыбіню
нырае і зноў вынырае:
качка-манашка.

Падняў з зямлі ліст
залаты: перайду
з ім вуліцы і завулкі.

Скасілася кукуруза:
спрабуюць
вырвацца з поля
абураныя камлюкі.

Вера,
надзея,
любоў —
праз туман
прабілася сонца.

Сцежка спынілася:
дол
услала лістота.

Начныя завулкі.
Знаходзяць
цень ад мяне ліхтары:
«Дык вось ён!..»

Гатовы да абароны?!.
Дровы

www.kamunikat.org

чакаюць зіму.

Пара дэвальвацыі:
залатоўкі
шпурляе бярэзіна,
клён — рублі.

Усіхні знаёмца —
хапае
вецер за рукі:
«Ну дык хадзем!..»

Нешта забылася?
У акно
ўглядаецца поўня.

Туды і сюды:
здабывае
з нетраў прасторы ў вежы
маятнік час.

Яшчэ бачыш сонца?!.
За грамадою
цёмных аблокаў
свеціцца аблачынка.

Яліна каля дарогі —
наказ у дарогу:
мо мне, мо табе.

Нехта пастукаўся —
выйшаў
у ноч: да твару
даткнулася далечыня.

З адвагаю і вагой
на хваіне
збіраюцца кроплі:
хто зараз?!.

Холадна.

Рукі
уцягваюцца ў рукавы.

Абмацвае вецер
галіны:
ці ўсе
лісты абляцелі?!.

Прыйшоў,
па траве патаптаўся
і адышоў за ўзгоркі:
першы мароз.

Замкнуліся дзверы:
кладзецца
разам з ключом у кішэню
гук.

Абапал дарогі бярэзіны:
падаюцца
адна за адною
ў зімовы змрок.

Можа, абудзіцеся?!.
З валунамі
вядзе гаворку зіма.

Свеціцца ў цемры акно:
завіруха,
ідзі папытайся,
хто там.
Вецер і снег.
Шкада мне
вас пакідаць у полі,
мае сляды.

1966-2006

www.kamunikat.org

Разанаў, А.

Дождж: возера ў акупунктуры: пункціры / Алесь Разанаў, — Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. — 162 с.

ISBN 978-985-6800-42-2.

Паэтычныя мініяцюры «Пункціры» спадарожнічаюць Алесю Разанаву ад пачатку творчага шляху. Яны ўваходзілі асобнымі раздзеламі ў яго паэтычныя зборнікі, шыхаваліся калонамі ў дзвюхмоўнай кнізе «Гановерскія пункціры», а зараз сабраліся разам — і ранейшыя, і самыя новыя, «швейцарскія», што яшчэ не аб'яўляліся ў друку.

Пункціры — акупункціры: у даступнай воку і думцы рэчаіснасці яны заўважаюць тое, што з'яўляецца своеасаблівым знакам гэтай рэчаіснасці, кранутае — яно змяшчаецца ў водгук і ўкладаецца ў радкі.

УДК 881.161.3-1

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год